PolotskSU

lМинистерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Полоцкий государственный университет»

# ПРОБЛЕМЫ И ПЕРСПЕКТИВЫ РАЗВИТИЯ ФИЗИЧЕСКОЙ КУЛЬТУРЫ, СПОРТА И ТУРИЗМА В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

Электронный сборник материалов
Республиканского научно-практического семинара
(Новополоцк, 24 марта 2017 г.)

Новополоцк
2017

PolotskSU

Все права на размножение и распространение в любой форме остаются за УО «Полоцкий государственный университет».

Нелегальное копирование и использование данного продукта запрещены.

Проблемы и перспективы развития физической культуры, спорта и туризма в Республике Беларусь : электрон. сб. материалов Респ. науч.-практ. семинара, Новополоцк, 24 марта 2017 г. / Полоц. гос. ун-т ; отв. за вып.: Е. Н. Борун. – Новополоцк : Полоцкий государственный университет, 2017. – 1 CD-ROM.

211440, ул. Блохина, 29,
г. Новополоцк
Тел.: 59-37-39, 39-40-46
http://www.psu.by

Компьютерная верстка: Дарьянова Татьяна Александровна
Программное обеспечение: Мядиль Анна Николаевна
Компьютерный дизайн: Мухоморова Мария Сергеевна

№ госрегистрации 3141711728

© Борун Е. Н., 2017
© Полоцкий государственный университет, 2017

PolotskSU

УДК 234(03.4)

# ФАРМІРАВАННЕ СІСТЭМЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ АХОВЫ НЕРУХОМАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў XIX - ПАЧАТКУ XX СТСТ.

***К.В. Андрэйчык,*** *выкладчык кафедры гісторыі і турызма Полацкага дзяржаўнага універсітэту*

Важную ролю ў пытанні аховы помнікаў гісторыі і культуры мае як развіццё гістарычнай навукі ў цэлым, так і звязаных з ёй лакальных краязнаўчых даследаванняў у прыватнасці. Для таго, каб плённа займацца аховай помнікаў мінулага неабходна наладзіць іх выяўленне, улік і ацэнку стану. У пачатку XIX стагоддзя яшчэ не існавала дзяржаўнага спецыялізаванага органа, на які была ўскладзена такая задача. Не існавала нарматыўна-прававых актаў, якія тычацца пытанняў у дадзенай сферы. Важна і тое, што не было адзінага падыходу да такіх паняццяў як "гісторыка-культурная каштоўнасць", "помнік культуры". Асноўныя мерапрыемствы ў галіне аховы помнікаў гісторыі і культуры на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пач. XX стст. праходзілі ў рэчышчы палітыкі, якая праводзілася ў Расійскай імперыі. Дзяржаўным органам, які павінен быў выступіць гарантам аховы нерухомай спадчыны мінулага стала Міністэрства ўнутраных спраў. Акрамя кантролю за выкананнем законаў і аховы грамадскага парадку, былі ўскладзены на міністэрства і адміністрацыйна-гаспадарчыя функцыі. Меркаваць аб паспяховасці выканання пастаўленых задач можна ацэньваючы шматлікія цыркуляры і праекты законаў [7].

Адным з асноўных стаў цыркуляр Міністэрства ўнутраных спраў, выдадзены 31 снежня 1826 года па загаду імператара Мікалая I. Ён прадпісваў грамадзянскім губернатарам дастаўляць звесткі аб наяўнасці і стане ў губернях старажытных будынкаў, а таксама забараняў разбураць такія будынкі. Гэты дакумент вызначаў дастаткова маштабную для таго часу праграму выяўлення і даследвання помнікаў архітэктуры і фактычна з'явіўся пачаткам важнага этапу ў станаўленні аховы помнікаў на дзяржаўным узроўні. Звесткі аб разбурэннях архітэктурных збудаванняў, адсутнасць уяўленняў аб маштабе гэтых разбурэнняў і аб рэальнай наяўнасці помнікаў у расійскіх губернях абумовілі неабходнасць прыняцця мер па выяўленні помнікаў архітэктуры на месцах з мэтай наступнай арганізацыі іх аховы. На Міністэрства ўнутраных спраў была ўскладзена

PolotskSU

задача па зборы фактычнага матэрыялу, правядзення даследаванняў, абагульненні статыстычных дадзеных у маштабе імперыі. Пачынаючы з 1820-х гг. Міністэрства ўнутраных спраў рэгулярна дасылала цыркулярныя лісты губернатарам з мэтай выяўляць усе неабходныя дадзеныя аб помніках: месцазнаходжанне, колькасць, захаванасць і г. д. У структуры міністэрства знаходзіўся шэраг падраздзяленняў, на якія таксама былі ўскладзены задачы па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, а менавіта Дэпартамент агульных спраў, Тэхніка-будаўнічы камітэт, Гаспадарчы дэпартамент, Дэпартамент паліцыі, будаўнічыя аддзялення ў губернскіх упраўленнях, губернскія статыстычныя камітэты [2].

Пасля апублікавання ўказа 1848 г. імператарам Мікалаем ІІ аб зборы звестак аб помніках даўніны ў беларускіх губернях былі абвешчаны пад аховай руіны замкаў і старадаўнія будынкі. А менавіта – Спаса-Ефрасінеўскі і Барысаглебскі манастыры ў Полацку, Мірскі, Нясвіжскі, Геранёнскі, Гальшанскі і іншыя замкі і іх руіны. Аднак Міністэрства ўнутраных спраў не сачыла за выкананнем гэтага указа. У выніку гэта прывяло практычна да разбурэння аб'ектаў.

Наступным этапам на шляху фарміравання сістэмы дзяржаўных органаў, якія ведаюць пытаннямі аховы помнікаў, стала адкрыццё ў 1859 г. пры Міністэрстве рімператарскага двара Імператарскай Археалагічнай камісіі. На гэтую дзяржаўную ўстанову была ўскладзена адказнасць за зберажэнне помнікаў гісторыі і культуры, збор і папаўненне старажытнасцямі музеяў, выдача дазволаў на археалагічныя раскопкі, распрацоўка прынцыпаў іх правядзення і фарміраванне архіваў. Мясцовыя ўлады павінны былі інфармаваць камісію аб знаходках і дасылаць на экспертызу. Калі ўзнікала неабходнасць разбурыць гістарычныя помнікі з-за вытворчай неабходнасці, камісія павінна была арганізаваць іх археалагічнае даследванне.

Пасля выдання указаў аб забароне разбураць і перабудоўваць старажытныя помнікі архітэктуры Імператарская археалагічная камісія разглядзела шэраг спраў аб падтрыманні ў належным стане старажытнасцяў на тэрыторыі Беларусі (Лідскі замак, Камянецкая вежа, Каложская царква)[6]. Вялікую ўвагу Імператарская археалагічная камісія надавала стану праваслаўных цэркваў, у тым ліку давала дазвол на іх рамонт або знос. У камісію паступалі прашэнні аб выдзяленні грашовых сродкаў на рамонт і рэстаўрацыю архітэктурных помнікаў. У прыватнасці камісіяй былі выдзелены грошы на рамонтныя работы ва Успенскім саборы Віцебска. На пасяджэнні камісіі па ахове пры Імператарскай археалагічнай камісіі разглядалася пытанне аб рамонце Траецкай царквы (1761). З гэтай просьбай

PolotskSU

звярнулася Полацкая духоўная кансісторыя. Ацэньваючы архітэктурную значнасць царквы, камісія накіравала галоўнага архітэктара Імператарскай археалагічнай камісіі П. П. Пакрышкіна для першаснай ацэнкі стану аб'екта [3].

Наступным, але па сутнасці дублюючым дакументам у галіне аховы помнікаў даўніны, стаў цыркуляр 1863г. "Аб дастаўленні звестак аб помніках расейскіх, што да айчыннай гісторыі і жыцця народаў адносяцца". Гэты дакумент павінен быў ўнесці ажыўленне ў дзейнасць мясцовых уладаў. Аднак такога не адбылося, бо  пазней выйшла серыя падобных (у 1865 г., 1869 г. і інш.). Гэта сведчыла аб не выкананні ўказаў на мясцовым узроўні.

Пачатак сістэматычным краязнаўчым даследаванням і выяўленні помнікаў архітэктуры ў Расійскай імперыі паклалі губернскія статыстычныя камітэты, якія былі створаны ў 1830-я гг. Яны  фарміравалі featureрознага роду звесткі аб тэрыторыях губерняў ў выглядзе дадаткаў да гадавых справаздач губернатараў. Губернскія статыстычныя камітэты не арганізоўвалі самі даследаванняў, яны толькі атрымлівалі гатовыя звесткі ад розных мясцовых органаў і надавалі ім пэўны уніфікаваны фармат. Таксама выступалі як звяно паміж мясцовай адміністрацыяй і Цэнтральным статыстычным камітэтам. Лагічным працягам ахоўнай дзейнасці дзяржавы стала адкрыццё губернскіх вучоных архіўных камісій. У 1884 г. было зацверджана Палажэнне Камітэта міністраў «Аб заснаванні вучоных архіўных камісій і гістарычных архіваў». Вялікі ўклад у развіццё ахоўнай справы на тэрыторыі Беларусі ўнесла, сярод іншых, Віцебская вучоная архіўная камісія (1909 г.).

Дзейнасць губернскіх архіўных камісій была даволі паспяховай. Гэта тлумачыцца тым, што ў правінцыі мелася кола людзей, энтузіястаў, якія на грамадскіх пачатках змаглі арганізаваць плённую дзейнасць па вывучэнні мінулага свайго краю, збору рэчавых, пісьмовых крыніц, спрыялі гістарычнай асвеце насельніцтва. Сярод іншых былі двараназемлеўладальнікі, многія з якіх служылі ў канцылярыях губернатараў, у казённых палатах, у акруговых судах і статыстычных камітэтах, у бальніцах і аптэках. Галосныя ў земскіх установах і гарадскіх думах, выкладчыкі ва універсітэтах, гімназіях, вучылішчаў, а таксама сябры Духоўнай кансысторыі, святары і прадстаўнікі купецкага саслоўя сталі ініцыятарамі магутнага навукова-асветніцкага руху па захаванню гістарычнай і культурнай спадчыны. Вынікамі археалагічных, археаграфічных, этнаграфічных пошукаў з'явілася стварэнне ў Беларусі гістарычных музеяў і архіваў, выданне многотомных навуковых зборнікаў. Камісія выдавала

PolotskSU

працы па гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі, археалогіі, прыкладам стаў зборнік «Працы Віцебскай вучонай камісіі» (Віцебск, 1910 г.), з 1911 года — «Полацка-Віцебская даўніна» (3 выпуску, 1911-1916) [5].

Амаль усе архіўныя камісіі Расійскай імперыі вялі археалагічныя раскопкі на тэрыторыі сваіх губерняў. Віцебская вучоная архіўная камісія атрымала загад ад начальніка штаба Віленскай ваенай акругі аб устанаўленні помнікаў на месцах баёў у 1812 г. Гэтаму мерапрыемству папярэднічала вялікая даследчая праца. Спецыяльны камітэт вёў працу па пошуку брацкіх магіл і рамонту існуючых помнікаў, у тым ліку архітэктурных. Капітул расійскіх ордэнаў выдзеліў грошы на рамонт Кульнёўскай царквы ў маёнтку Ільзенберг Рэжэцкага павета Віцебскай губерні. Так па распараджэнні прадвадзіцеля дваранства І. І. Скварцова і з дапамогай работнікаў архіўнай камісіі быў створаны будаўнічы камітэт, які да 100-годдзя генерала Я. П. Кульнева адрамантаваў царкву[5].

У Нацыянальным гістарычным архіве Рэспублікі Беларусь сустракаюцца рапарты аб пошукавай дзейнасці мясцовых уладаў: *“Господину, витебскому губернатору от 26 марта 1911. От дриссенского исправника – братские могилы имеются в лесу имения Кульбово Сушковской волости, в местности под названием Бор. Могилы мало заметны и для приведения их в надлежащий вид потребуется 100 р. В саду фольварка владельцев баронов Будбергов находящегося в Клястицах. по указанию местного почтово-телеграфного отделения, Корбута имеются братские могилы. Местность не представляет собой могилы. Москочья гора на которую старожилы указывают как на братскую могилу в настоящее время представляет из себя пахатное поле. А частью под лесом, некоторые лица говорят, что здесь находился сарай, где хранилась французская амуниция. Затем в Клястицах около церкви имеется могила, где в настоящее время хранится памятник войне1812 г. В местности Сергиевский Борок, под имением Якубово в местности под названием Панцыри имеется несколько сопок. Подобные сопки встречаются в других местностях, но можно ли их прнимать за могилы …”*. [4]

Сярод карэспандэнцыі Віцебскай вучонай архіўнай камісіі сустракаюцца рапарты з паведамленнем аб наяўных помніках даўніны. У рапарце Люцинского павятовага іспраўніка пішацца: *“В городе Люцин имеются развалины старинного замка относящегося к XV столетию, сохранились только стены, которые сохранились в некоторых местах до 7 саженей. Но под влиянием непогоды постепенно осыпаются. Также имеются развалины в местечке Мериенгаузен на озере Острова того же наименования. Сведения о замках есть в издаваемом в 1903 г. издании витебского*

PolotskSU

*статистического губернского комитета. В Люцин производились раскопки древнего могильника, собранная коллекция разных предметов у проживающего в городе Люцин потомственного гражданина Людвига Иосифовича Фохта*". [4]

Падобныя паведамленні толькі падцвярджаюць адсутнасць на той момант якіх-небудзь сістэматычных дзеянняў з боку як цэнтральных, так і мясцовых уладаў па ўліку, вывучэнню і захаванню помнікаў гісторыі і культуры.

Такім чынам, у выніку дзейнасці Міністэрства ўнутраных спраў адзіны закон па ахове помнікаў у дарэвалюцыйны перыяд так і не быў прыняты. Аднак былі распрацаваны і сфармуляваны праекты законаў, на аснове якіх выпрацоўваліся метады аховы помнікаў архітэктуры. Цыркуляры былі асноўнымі дакументамі, на якія абапіраліся пры распрацоўцы метдаў аховы помнікаў архітэктуры. Канчаткова сістэма дзяржаўных органаў, якія ведалі пытаннямі аховы помнікаў, склалася з заснаваннем у 1859 г. пры Міністэрстве імператарскага двара Імператарскай Археалагічнай камісіі. Важна адзначыць, што галоўная роля ў захаванні архітэктурнай спадчыны належала шматлікім навуковым таварыствам, музеям і асобным даследчыкам.

ЛІТАРАТУРА


1. Грабянчук, И.Р. Дзяржаўная палітыка па ахове помнікаў гісторыі як умова развіцця музейнай справы ў Беларусі ў канцы XVIII – пач. XXстст. / Беларускі гістарычны часопіс. – 2011. - №2. С.31-36
2. Замалина, Л.Г. Витебская ученая архивная комиссия: история, документы / Материалы научно-практической конференции, посвященной 90-летию Витебской ученой архивной комиссии, Витебск (24 ноября), 1999, С. 17-23
3. Клепікаў, М.А. Віцебская вучоная архіўная камісія і ахова старажытных помнікаў даўніны / Беларускі гістарычны часопіс. – 2002. - №4. С. 37-39
4. Несцярчук, Л.М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: Асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы / Л.М. Несцярчук. – Мінск: БЕЛТА, 2003. – 286 с.
5. Слюнькова, И.Н. Храмы и монастыри Беларуси XIX века в составе Российской империи. Пересоздание наследия. – М.: Прогресс-Традиция, 2009. – 631с., ил.
6. Старостина, Ю.Н. Правовое регулирование охраны памятников культуры в России в XVIII- нач. XX вв.: обзор законодательных материалов. / Вопросы теории и истории государства и права, 2007. – С.15-18
7. Mienicki, R. Wilenska Komisja Arheologiczna (1865-1915) / R. Mienicki. – Wilno: PTK, 1925. – 468.